ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№19 (1072)
ЧАЦВЕР, 25 лістапада 2004 г.
Выходзіць два разы ў месяц
Цана дагаворная

*Газета заснавана ў верасні 1969 года*

## ДЫЯЛОГ СА СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДДЗЮ

"Дзяржава і студэнцкая моладзь: дыялог працягваецца" – такой была тэма сустрэчы міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А.М. Радзькова са студэнцкім актывам вышэйшых навучальных устаноў, якая адбылася нядаўна ў Мінскім лінгвістычным універсітэце. У час яе абмяркоўваўся самы шырокі спектр пытанняў – ад вучобы да культурнага і спартыўнага жыцця юнакоў і дзяўчат, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю.

У выступленні А.М. Радзькова асвятляліся асноўныя палажэнні праекта Закона аб вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, вынікі ўступнай кампаніі ў вну у 2004 годзе, роля сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у грамадзянскім выхаванні моладзі. У форме зацікаўленага дыялогу з прадстаўнікамі вну усіх абласцей рэспублікі вялася размова аб развіцці студэнцкай навукі, самакіравання, аб маладзёжных арганізацыях у вышэйшых навучальных установах, неабходнасці сцвярджэння ў студэнцкім асяроддзі здаровага ладу жыцця і г.д.

Удзельнікамі сустрэчы было зададзена шмат пытанняў, на якія міністр адукацыі, яго намеснікі далі вычарпальныя адказы.

Наш універсітэт на сустрэчы прадстаўлялі студэнтка эканамічнага факультэта Наталля Северына, якая ўдастоена стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, і першы сакратар камітэта БРСМ Сяргей Дзегцяроў.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На чарговым пасяджэнні Савета універсітэта, якое адбылося 17 лістапада, па дакладу дэкана М. Храмчанковай дэталёва абмеркавана пытанне аб стане спраў на біялагічным факультэце і перспектывах яго развіцця. Як адзначалася, разам са станоўчымі момантамі ў жыццядзейнасці факультэта (з году ў год тут стабільна высокая паспяховасць студэнтаў, адкрыты Савет па абароне дысертацый і інш.) ёсць яшчэ нямала аспектаў, якія неабходна ўдасканальваць. Так, у прыватнасці, шмат праблем існуе на новай спецыяльнасці "Лясная гаспадарка", патрабуе сур'ёзнай мадэрнізацыі матэрыяльная база факультэта, у сувязі са змяншэннем прадстаячага набору на педагагічныя спецыяльнасці стаіць задача вызначыць патрэбы ў біёлагах вытворчага накірунку, шукаць больш цесныя формы супрацоўніцтва з Інстытутам лесу НАН Б і інш. На Савеце прыняты за аснову праект пастановы, накіраванай на далейшае ўдасканаленне вучэбнага працэсу, актывізацыю навукова-даследчай і арганізацыйна-выхаваўчай работы на факультэце.

Аб выніках работы навукова-метадычнага савета універсітэта за 2003-2004 навучальны год і асноўных задачах на новы навучальны год далажыў прарэктар па вучэбнай рабоце, старшыня НМС І.В. Семчанка.

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце Д.Р. Ліна падтрыманы вылучаныя на конкурс работы маладых вучоных і спецыялістаў на прысуджэнне прэмій Гомельскага аблвыканкама: па раздзелу "Фундаментальныя даследаванні" – работы к.х.н., дацэнта кафедры хіміі **Н.І. Драздовай**, к.б.н. **У.А. Собчанкі**, к.э.н. **У.А. Шчэпава,** к.ю.н., дацэнта кафедры крымінальнага права і працэсу **Я.В. Багданава**; па раздзелу "Прыкладныя даследаванні" – работа асістэнта кафедры заалогіі і аховы прыроды к.б.н. **А.В. Крука**; па раздзелу "Вынаходніцкая дзейнасць" – распрацоўка к.ф.-м.н., дацэнта кафедры радыёфізікі і электронікі **А.В. Семчанка**. Таксама вылучаны на рэспубліканскі конкурс 2004 года студэнцкія навуковыя работы.

Заслухана пытанне аб арганізацыі харчавання студэнтаў. З інфармацыяй выступілі дырэктар прадпрыемства грамадскага харчавання ГДУ Т.М. Соціева і старшыня прафкама студэнтаў Н.І. Колтышава. Адзначана, што праведзенае сярод студэнтаў анкетаванне засведчыла: асартымент, якасць страў, іх кошт, узровень абслугоўвання ў цэлым іх задавальняюць. Работнікі прадпрыемства грамадскага харчавання ідуць насустрач пажаданням студэнтаў – арганізавана работа буфетаў у вучэбных карпусах па суботах.

Члены Савета далі рэкамендацыю для паступлення ў дактарантуру дацэнту кафедры беларускай мовы Л.М. Мінаковай, зацвердзілі базавыя вучэбныя планы спецыяльнасцей "Сацыяльная работа", "Сацыяльная педагогіка", тэмы кандыдацкіх і магістэрскіх дысертацый.

На Савеце выбраны і перавыбраны на вакантныя пасады прафесарска-выкладчыцкі састаў: загадчыкамі кафедр: радыёфізікі і электронікі – к.ф.-м.н., дацэнт **В.М. Мышкавец**, батанікі і фізіялогіі раслін – к.б.н., дацэнт **М.М. Дайнэка**, французскай мовы – к.ф.н., дацэнт **С.М. Калацэй**, рускай літаратуры – к.ф.н., дацэнт **І.М. Афанасьеў**, усеагульнай гісторыі – д.г.н., прафесар **Р.Р. Лазько**, грамадзянска-прававых дысцыплін – к.э.н. **С.Г. Шулейка**. Савет хадайнічаў перад ВАКам Рэспублікі Беларусь аб прысваенні вучонага звання прафесара загадчыку кафедры АСАІ д.т.н. **А.М. Дземідзенку**.

Нашы студэнткі

## НА СЕСІЮ – У БЕЛАСТОК

**Кожны з вас ведае, што вучыцца на "выдатна" – даволі складана. Гэта вымагае шмат часу, цярплівасці, сур'ёзнасці, здольнасцей... А калі быць студэнтам адразу двух універсітэтаў? Не здзіўляйцеся, на наш гонар, ёсць такія мэтанакіраваныя і таленавітыя!**

**Мая субяседніца – Ірына Сойка, студэнтка гр. БА-43 філалагічнага факультэта, якая ў верасні бягучага года стала першакурсніцай Беластоцкага універсітэта ў Польшчы.**



**– Ірына, з чаго пачалося тваё захапленне польскай мовай?**

– Калі я даведалася, што мы будзем яе вывучаць на сваім факультэце, мяне гэта адразу зацікавіла. Падумала, што можна будзе параўнаць з ёй іншыя славянскія мовы: рускую, беларускую, украінскую.

Спачатку я займалася ў агульнай групе, а потым з'явілася магчымасць паехаць на моўныя і метадычныя курсы ў Польшчу.

**– Ці спадабалася падарожжа?**

– Так. Было вельмі цікава. Даведалася аб новых методыках выкладання польскай мовы. Уразіў высокі ўзровень арганізацыі нашай работы.

Пасля вяртання я цэлы вучэбны год на добраахвотных пачатках займалася па гэтым прадмеце з 10-класнікамі ў адной са школ г. Гомеля.

**– Назапасіўшы веды і вопыт, ты вырашыла паступіць у Беластоцкі універсітэт?**

– Пачалося з таго, што ўлетку польскае прадстаўніцтва ў Гродне прапанавала ўсім жадаючым паступіць у філіял Беластоцкага універсітэта на завочнае аддзяленне. Я паспяхова вытрымала экзамены, стала яго студэнткай.

**– Як ты бачыш сваю будучыню?**

– Пасля заканчэння вучобы я атрымаю спецыяльнасць "Педагогіка культуразнаўчая", і, як кожны чым-небудзь захоплены чалавек, мару рэалізаваць свае здольнасці ў працы з дзецьмі або ў якасці перакладчыка, і абавязкова ў Беларусі. Я лічу, што тут больш магчымасцей для здзяйснення маіх мэт. Польская мова ў нас лічыцца рэдкай, таму няшмат спецыялістаў у гэтай галіне.

**– Як сумяшчаеш вучобу ў розных універсітэтах?**

– Некаторыя складанасці звязаны з тым, што даводзіцца шмат працаваць у бібліятэках. Але ёсць у гэтым і станоўчае: правільная арганізацыя вольнага часу дапамагае ўсё паспець і мець магчымасць адпачыць. Пакуль мне падабаецца ўсё – новыя людзі, выкладчыкі, абраная спецыяльнасць і многае іншае. Хутка – першая сесія, пасля яе і можна будзе падводзіць вынікі.

**– Я ўпэўнена, што яны будуць добрымі. Жадаю табе поспехаў і энтузіязму для дасягнення ўсіх пастаўленых мэт.**

**Марына ДЖАЛАЯ.**

**На здымку: студэнтка 4-га курса філфака Ірына Сойка.**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## ВЫБИРАЕМ ЗДОРОВЬЕ!

**Выставка конкурсных плакатов, стенных газет на тему профилактики СПИДа в молодежной среде пройдет в нашем университете 29 ноября, а 1 декабря жюри подведет итоги и определит лучших среди участников – факультетов и общежитий.**

В этом году Всемирный день профилактики СПИДа проводится под девизом **«Женщины, девушки и ВИЧ/СПИД»**.

На 1 октября 2004 г. в Беларуси зарегистрировано 6064 ВИЧ-инфицированных, из которых 3499 (57,7 %) приходится на Гомельскую область. Из 3499 ВИЧ-инфицированных, зарегистрированных здесь, более 30 % (1084) составляют женщины в репродуктивном возрасте. Эта численность имеет тенденцию к увеличению в силу все большего распространения ВИЧ-инфекции половым путем.

Основными причинами заражения ВИЧ-инфекцией молодых людей являются любопытство и стремление к новым впечатлениям, влияние на них сверстников. Кроме того, при ярко выраженных сексуальных желаниях, отсутствует жизненный опыт, недостаточны знания и не развито чувство ответственности перед другими людьми.

**(Небольшой срез общественного мнения по проблеме СПИДа читайте на 4-й полосе газеты).**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны старшы выкладчык кафедры спартыўных дысцыплін **МАКАРЭВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч**. Таксама ён удастоены Ганаровай граматы абласнога Савета дэпутатаў.

***

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны старшы выкладчык кафедры вышэйшай матэматыкі **КУРНОСЕНКА Мікалай Міхайлавіч**.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі горача віншуюць дэкана названага факультэта **ГАПАНОВІЧ-КАЙДАЛАВА Мікалая Уладзіміравіча** з прысваеннем яму Прэзідыумам ВАКа Беларусі вучонага звання дацэнта.

***

Калектывы факультэта фізічнай культуры, кафедры АЛФК горача віншуюць з 75-годдзем з дня нараджэння дацэнта **Віктара Іванавіча КУЗНЯЦОВА** і жадаюць яму поспехаў у працы, актыўнага даўгалецця, аптымізму і моцнага здароўя!

## ЦІКАВАЯ І КАРЫСНАЯ СУСТРЭЧА

Нядаўна на філалагічным факультэце адбылася сустрэча студэнтаў з карэспандэнтам прэсслужбы УУС аблвыканкама Віталем Прыстромавым. Ён расказаў аб тыповых правапарушэннях, што маюць месца сярод школьнікаў і ўвогуле непаўналетніх, метадах іх прафілактыкі, пазнаёміў з крымінальнай сітуацыяй, якая склалася на Гомельшчыне. Таксама В.Прыстромаў падкрэсліў ролю настаўніка ў фарміраванні светапогляду дзяцей і даў карысныя парады, як выхоўваць "цяжкіх" падлеткаў.

Размова атрымалася пазнаваўчай, аўдыторыя задавала пытанні.

**Наталля СТАРЧАНКА.**

## БЕЛАРУСЬ И ШВЕЦИЯ: СОТРУДНИЧЕСТВО ФИЗИКОВ-ТЕОРЕТИКОВ

На базе Белорусского государственного университета в середине ноября проходил контактный семинар по вопросам сотрудничества в сфере образования и науки с партнерами из Швеции. В его работе приняли участие 42 представителя шведской стороны и 68 – белорусской. ГГУ на семинаре представляла к.ф.-м.н., доцент кафедры теоретической физики О.М. Дерюжкова.

Инициатором семинара, целью которого было развитие программ международного академического обмена между белорусскими и шведскими коллегами, являлся Шведский Институт. Участникам были представлены уже действующие программы сотрудничества (Балтийского университета, «Новая Висбю», TEMPUS, связи с Королевской Высшей Технической Школой, Стокгольмским университетом и др.) и предоставлена возможность завязать новые контакты. Участие ГГУ в данном обмене выражается в научном сотрудничестве кафедры теоретической физики с учеными из группы молекулярной физики Стокгольмского университета, которое длится уже четыре года. Это взаимные научные командировки сотрудников кафедры теоретической физики Т.А. Алферовой, В.Н. Капшая, О.М. Дерюжковой, Е.А. Дея и шведских ученых Матса Ларссона, Нильса Эландера, а также учеба в аспирантуре Стокгольмского университета выпускников кафедры теоретической физики С.А. Вербицкой, К.П. Шиляевой.

Подробную информацию о Швеции, Шведском Институте, научных и образовательных программах, а также о возможности участия в них можно узнать на сайтах:

**www.sweden.se**
**www.hsv.se**
**www.studyinsweden.se**
**www.si.se**
**www.balticuniv.uu.se**
**www.folkuniversitetet.se**
**www.kth.se/eng**

Предостережение

## ...ЗА ПРИЗРАЧНЫМ СЧАСТЬЕМ

В последнее время особую актуальность для нашей республики приобрела проблема торговли женщинами и детьми. Этому способствует свободная возможность выезда граждан Беларуси за рубеж на работу, и зачастую основным источником информации для молодых женщин являются рекламные предложения различных фирм о трудоустройстве, а также соответствующие сайты Интернета, по которым можно найти себе мужа за границей... К сожалению, выезды на «работу» или за личным счастьем заканчиваются для белорусских девушек весьма плачевно.

В нашей стране на 2002-2007 годы принята Государственная программа комплексных мер по противодействию торговле людьми и распространению проституции. Программа предусматривает сотрудничество Министерств образования, здравоохранения, МВД, КГБ, таможенных структур и ее активно поддерживают представительство ООН в Республике Беларусь, Международная организация по миграции. В целях предостережения молодых девушек от роковых ошибок поставлена задача вести информационно-образовательную и профилактическую работу и среди учащейся молодежи.

В нашем университете прошла встреча студентов факультета иностранных языков, исторического и экономического факультетов с руководителем проекта по предотвращению торговли женщинами в Беларуси Ю.О. Федоровым и автором, режиссером фильма «Элькина мечта» М. Малиновской. Открывая встречу, ее организатор заведующая кафедрой политической социологии ГГУ доктор социологических наук О.С. Осипова отметила возможность и необходимость информационного, культурного международного обмена, участниками которого становятся наши студенты, выезжая за границу, при этом подчеркнула, что об опасности быть обманутыми разного вида «работодателями» нужно помнить всегда.

Студенты посмотрели фильм-предупреждение, снятый М. Малиновской, построенный на интервью с молодыми женщинами, 13-летней девочкой, побывавшими в сексуальном рабстве за границей. По реакции аудитории было понятно, что увиденное и услышанное потрясло и заставило задуматься каждого.

**Т. НИКОЛАЕВА.**

Адвечнае

# З КЛОПАТАМ ПРА ЛЁС СЛАЎЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Усходняе Палессе – унікальны рэгіён са своеасаблівай гісторыяй, этнічнымі, культурнымі і моўнымі асаблівасцямі. Тут найбольш поўна захаваліся ў розных праяўленнях архаічныя элементы традыцыйнай народнай, духоўнай і матэрыяльнай культуры. Асаблівая значнасць палескай тэрыторыі звязана з яе цэнтральным палажэннем на стыку трох усходнеславянскіх этнасаў, што ператварае дадзены рэгіён у зону міжэтнічных узаемасувязяў і узаемаўплываў. Зыходзячы з гэтага, узнікае задача захаваць, зберагчы і развіць разнастайныя формы і традыцыі ўсходнеславянскай народнай культуры, непаўторнай славянскай духоўнасці.

Разумеючы гэта, на з'ездзе славянскіх народаў Беларусі, Расіі і Украіны, які адбыўся летам 2001 г. у Маскве, былі выпрацаваны асноўныя напрамкі іх сумесных дзеянняў. Было намечана стварэнне Міжнароднага славянскага інстытута нацыянальных даследаванняў са статусам некамерцыйнай даследчай установы. І такі інстытут быў адкрыты ў 2002 г. пры нашым універсітэце. Ён атрымаў назву Навукова-даследчага інстытута гісторыі і культуры усходнеславянскіх народаў, асноўнай мэтай якога стала развіццё комплексных фундаментальных даследаванняў гісторыка-культурнай спадчыны ўсходнеславянскіх народаў, развіццё навуковага супрацоўніцтва з зацікаўленымі арганізацыямі Расіі і Украіны, абмен навуковай інфармацыяй, правядзенне фестываляў народнай творчасці трох суседніх рэспублік і інш.

Важным этапам у развіцці інтэграцыйных працэсаў з'явілася стварэнне Еўрарэгіёна "Днепр", які аб'ядноўвае тры ўсходнеславянскія дзяржавы – Беларусь, Украіну і Расію. Мэта яго дзейнасці –супрацоўніцтва на аснове фарміравання беларуска-расійска-ўкраінскіх груп. У кола іх інтарэсаў уваходзіць (у ліку іншых) развіццё супрацоўніцтва ў галіне навукі, адукацыі і культуры.

Значным крокам у захаванні і развіцці славянскай культуры, а таксама ў мэтах больш эфектыўнага выкарыстання навуковага патэнцыялу Еўрарэгіёна «Днепр» стала стварэнне ў кастрычніку г.г. Міжнароднай навуковай асацыяцыі «Інстытут славістыкі». Дагавор аб стварэнні і супрацоўніцтве падпісалі рэктары трох вышэйшых навучальных устаноў – Бранскага дзяржаўнага універсітэта імя акадэміка І.Пятроўскага, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны і Чарнігаўскага педагагічнага універсітэта імя Т.Р.Шаўчэнкі. На сустрэчы быў прыняты статут і выпрацаваны асноўныя мэты і прадмет дзейнасці, якія ўключаюць фундаментальныя і прыкладныя даследаванні расійска-украінска-беларускага памежжа ў гістарычным і актуальных аспектах па самых розных накірунках: супастаўляльнае вывучэнне традыцыйнай культуры, гістарычная і палітычная геаграфія, сацыяльна-эканамічнае развіццё славянскага свету, дэмаграфічныя працэсы, узаемадзеянне культурных традыцый і інш.

Інстытут славістыкі створаны, і да яго работы запрашаюцца ўсе, каму неабыякавы лёсславянскай культуры.

**А. ВОІНАВА,**
**вучоны сакратар Інстытута гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ імя Ф.Скарыны.**



**На здымку: у перапынку III Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Скарына і наш час", якая праводзілася пры падтрымцы Навукова-даследчага інстытута гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў, яго дырэктар доктар філалагічных навук, прафесар А.А. Станкевіч разам з даследчыкам гравюр Ф. Скарыны М.М. Палкаўнічэнкам абмяркоўваюць праблемныя, дыскусійныя пытанні распрацоўкі тэмы Скарыніяны ў мастацтве.**

**ФОТА У. ЧЫСЦІКА.**

**О**коло 100 студентов разных вузов республики – Минска, Бреста, Витебска, Могилева, Гродно, Полоцка, Барановичей собрались в Гомельской областной лингвистической гимназии на заседание «Английского клуба». Второй раз такое масштабное мероприятие проводится в нашем городе. В прошлом году его участников принимали студенты факультета иностранных языков ГГУ.

## СЕССИЯ «АНГЛИЙСКОГО КЛУБА»

Молодые люди, хорошо знающие английский язык, собираются, чтобы обсудить интересующие и волнующие их вопросы, касающиеся жизни студенчества, экологические проблемы и совместно найти пути их решения.

Участники нынешней сессии работали в 9 комитетах. В каждом из них была своя тема, проблема, ответы и решения на которые студентам предстояло найти в горячих спорах и дискуссиях.

Свои творческие таланты студенты смогли продемонстрировать во время концерта, в программу которого вошли сценки и миниатюры на белорусском и английском языках, танцы.

Гости имели возможность совершить увлекательную экскурсию по городу Гомелю, впечатления от которой у них останутся надолго. А закончилось мероприятие дегустацией блюд, которые представила каждая из делегаций.

Большую организационную работу по проведению заседания «Английского клуба» провели студентки факультета иностранных языков нашего университета Екатерина Новак, Ольга Барботкина, Мария Куденович, Константин Шафаростов, Юлия Абрамович и др., которые выражают искреннюю благодарность за поддержку первому секретарю комитета БРСМ ГГУ С. Дегтяреву, второму секретарю городского комитета БРСМ В. Восареву, директору ГЦК О. Рыжкову.

Белорусская международная Модель ООН 2004

# СТАЛИ НА ВРЕМЯ ... ДИПЛОМАТАМИ

**Представительство Управления Верховного комиссара Организации Объединенных Наций по делам беженцев (УВКБ ООН) в Республике Беларусь отмечает высокий уровень подготовки студентов Вашего университета и выражает благодарность Вашей студентке Корзун Веронике за активное и высокопрофессиональное участие в акции «Моделирование ООН», которая была проведена УВКБ ООН 20-21 октября с.г. в Национальном пресс-центре Республики Беларусь в ознаменование Дня ООН.**

**С уважением Глава Представительства УВКБ ООН в Республіке Беларусь**
**Илья ТОДОРОВИЧ.**

**Международное общественное объединение по изучению ООН и информационно-образовательным программам, факультет международных отношений БГУ при поддержке Представительства ООН в Беларуси, Европейской комиссии и Представительства Управления Верховного комиссара ООН по делам беженцев проводили недавно Белорусскую международную модель ООН 2004. Мероприятие включало в себя тренинг для участников по вопросам подготовки к Модели ООН и Модель заседания Совета Безопасности ООН. На повестке дня стоял вопрос – «Проблема допуска на территорию стран Европейского союза лиц, ищущих убежище из конфликтных регионов (Ирак, Афганистан, Чечня и др.)».**

ЧТО ЖЕ ТАКОЕ МОДЕЛЬ ООН?

Моделирование Организации Объединенных Наций — это ролевая игра, во время которой имитируется работа органов системы ООН. Участники играют роли представителей государств — членов Организации и обсуждают текущие вопросы повестки дня ООН. Путем проведения переговоров, действуя на основе принципов дипломатии, участники игры ищут пути решения глобальных проблем, стоящих перед мировым сообществом (проблемы окружающей среды, экономического развития, беженцев, СПИДа, разрешения конфликтов, разоружения и прав человека). Участвуя в подобном мероприятии, молодые люди получают уникальную возможность познакомиться на собственном опыте с дипломатической работой Организации Объединенных Наций и процессом принятия решений. Моделируя ООН, студенты и школьники становятся на место дипломатов этой организации. Они решают глобальные мировые проблемы, с которыми приходится справляться настоящим сотрудникам в реальной жизни: готовят проекты резолюций, разрабатывают стратегию, ведут переговоры с союзниками и противниками, разрешают конфликты, оперируя правилами процедуры ООН в интересах международного сотрудничества, для решения проблем, касающихся всех стран Земли. Одно из существенных отличий модели ООН от настоящей Организации — это время. Работа ООН продолжается непрерывно из года в год, в то время как моделирование ООН может длиться всего лишь несколько часов или дней. Чувство времени вынуждает проводить игру в довольно интенсивном режиме.

Представитель УВКБ ООН в Беларуси Илья Тодорович выступал в роли Председателя СБ ООН. Участники модели представляли страны-члены Совета Безопасности и пытались разрешить гипотетический конфликт, связанный с ситуацией на белорусско-польской границе.

Предыстория: На территории Российской Федерации был осуществлен ряд террористических актов. Данные события спровоцировали появление многочисленных потоков беженцев, которые направились к границам стран Европейского союза. На территории Республики Беларусь, в районе белорусско-польской границы в Бресте находится около 10 000 тысяч лиц ,ищущих убежище из Афганистана, Ирака, Чечни. Среди них большинство составляют женщины и дети. Польская сторона отказала им во въезде. У белорусской стороны нет возможности обеспечить им достойные условия проживание и снабдить их продуктами питания.

Участники игры, действуя в соответствии с Уставом ООН, Временными правилами процедуры Совета Безопасности и с учетом реальной позиции стран-членов СБ, должны были найти выход из дипломатического «тупика» и принять резолюцию, отражающую интересы всех членов международного сообщества.

В конференции приняли участие студенты из Беларуси, Украины, России, Литвы, Латвии, Польши, Молдовы и других стран. Рабочим языком Модели был английский язык.

В состав белорусской делегации входили студент 4 курса факультета международных отношений БГУ Сергей Гутавец, курсант Академии МВД Александр Скобля и автор этих строк. Нами была вынесена на обсуждение резолюция, которая включала пункты как по урегулированию ситуации с беженцами в международном масштабе, так и пункты, касающиеся конкретной ситуации, то есть белорусско-польский конфликт. Страны ЕС вносили в нее поправки, и в результате мы пришли к соглашению по решению гипотетической проблемы.

Участие в моделировании ООН дало нам знание о структуре, функциях, целях организации, внешней политике стран-членов Совета Безопасности, позволило усовершенствовать навыки проведения исследования, публичного выступления, участия в дебатах. В общем, за эти несколько дней мы почувствовали, что такое быть дипломатом, и что значит принимать участие в решении глобальных человеческих проблем.

**Вероника КОРЗУН,**
**студентка 4 курса исторического факультета.**

Аб конкурсе "Ану, першакурснік!"

# НОВЫЯ "СТАРЫЯ" ЧЭМПІЁНЫ

"Каго мы выпускаем?" – хвалюючае пытанне для ўсіх вну напрыканцы дзяржэкзаменаў і абароны дыпломаў. "Каго мы набралі?" – вось што цікавіць калектыў універсітэта ў самым пачатку навучальнага года. З мэтай высветліць, якога ж гатунку сёлетнія навабранцы ў плане творчых здольнасцяў, прайшоў 34-ты традыцыйны конкурс "Ану, першакурснік!".

Як і ў мінулым годзе, канцэрт праходзіў у два дні пры падтрымцы перапоўненай гледачамі залы. Парадак выступлення факультэтаў быў размеркаваны напярэдадні шляхам жараб'ёўкі. Першымі на сцэну выходзілі будучыя гісторыкі, завяршалі конкурсную праграму псіхолагі. Але на вынікі гэта ніяк не паўплывала.

Вызначыць самых таленавітых арганізатар "Першакурсніка" – студэнцкі клуб ГДУ запрасіў аўтарытэтнае журы ў складзе дырэктара маладзёвага комплексу Аляксандра Лысянкова, выкладчыка акцёрскага майстэрства, грыму, сцэнічнай падрыхтоўкі Вольгі Сакаловай, мастацкага кіраўніка і харэографа групы сучаснай харэаграфіі "Квадра" Іны Асламавай, выкладчыка па вакалу і пастаноўцы голасу Марыны Лавянецкай, рэжысёра Уладзіміра Клінчука, дырэктара радыё "Эксп-рэс – Гомельская хваля" Сяргея Краснаборода і рэжысёра студэнцкага клуба Антаніны Давыдавай.

Не як у мінулым годзе было амаль усё астатняе: тэма – "Пачатак!", жарты, песні, танцы і, канешне ж, самі першакурснікі – галоўныя дзеючыя асобы конкурсу. А яшчэ быў новы кубак! Вельмі прыгожы! Яго набылі з дапамогай прафкама студэнтаў. Ну і паколькі гаворка ўжо зайшла пра асноўны трафей, то я не стану нерваваць чытача няведаннем і вытрымліваць тэатральную паўзу, а адразу ж скажу пра тое, аб чым прынята пісаць у канцы: пра вынікі. Яны такія: 7-е месца – геолага-геаграфічны факультэт, 6 – факультэт фізічнай культуры, 5 – псіхолагі, матэматыкі, юрысты, 4 – эканамісты, 3 – біёлагі, факультэт замежных моў, 2 – гістарычны, фізічны факультэты. Першае ж месца, як летась, заняў філалагічны факультэт! Стабільнасць – гэта прыкмета майстэрства і, у першую чаргу, майстэрства мастацкага савета філфака на чале з трыумфальным культоргам Вікторыяй Канавалавай. Менавіта дзякуючы ім філолагі – новыя "старыя" чэмпіёны!

Праўда, трэба сказаць, што і канкурэнцыі асаблівай не было. Гісторыкі хіба што добра спявалі, біёлагі таксама, плюс захапляліся біякефірам, эканамісты выдалі Гераклюшу, які пайшоў "на ўра", факультэт фізічнай культуры здорава падняўся і паказаў неблагі пачатак Алімпійскіх гульняў. А вось геолага-географы і юрысты асабіста мне нічым не запомніліся...

На другі дзень выступалі матэматыкі, і іх дзень сурка хутчэй надакучыў, чым уразіў. Фізікі, якім добра ўдалася сцэнка са спісамі паступіўшых у ГДУ; "замежнікі", што былі вельмі эмацыянальнымі, прагна жадалі заняць "нейкае" (з намёкам) месца і яскрава станчылі танец жывата; псіхолагі, пачатак праграмы якіх быў даволі масштабным, адчувалася магутнасць падыходу, але да канца ці хаця б да сярэдзіны вытрымаць у такім жа стылі яны не змаглі, магчыма, акцёрскія дадзеныя падкачалі.

Выступалі ў другі дзень і трыумфатары – філолагі! Яны паказалі праграму ў традыцыях філфака: добры гумар і сцэнічнае майстэрства (новая Фішка – кандуктар Маня Татальны кантроль; выканаўца ролі – Марына Жураўская), маладажоны (асабліва нявеста Віка; выканаўца ролі – Вікторыя Проніна), выдатны вакал і цудоўныя танцы. Як вынік – першае месца!

34-ты "Першакурснік" у цэлым прайшоў няхай і не так яскрава, як папярэдні, але ўсё роўна на звыклым для сябе высокім узроўні, бо, як вядома, што для яго "сярэдне", тое для конкурсаў і канцэртаў іншых ВНУ – недасягальная велічыня...

## КАМЕНТАРЫІ

*Антаніна ДАВЫДАВА, член журы:*

*– Узровень каманд гэтага года высокі, менавіта таму так шмат падзеленых месцаў. Культоргі факультэтаў з кожным разам усё больш удасканальваюцца. Вялікую ролю адыгрываюць і самі першакурснікі, ды і наш студэнцкі клуб аказвае пры падрыхтоўцы любую тэхнічную і метадычную дапамогу. Што тычыцца пераможцаў, то яны былі на сцэне проста цудоўныя. Культорг Вікторыя Канавалава валодае значнымі арганізатарскімі здольнасцямі, яна "запаліла" сваіх выхаванцаў. Філолагі выступалі з натхненнем, а адпаведны настрой – гэта вялікая справа! У журы не было сумненняў, каму аддаць першае месца.*

*Вікторыя КАНАВАЛАВА, культорг філфака;*

*– Я не люблю гультайства і неарганізаванасці ў працы, заўсёды павінна быць дысцыпліна. Я вучу канкурсантаў у першую чаргу гэтаму. Па-другое, вучу выкладвацца поўнасцю, кожны павінен працаваць да таго часу, пакуль праграма не будзе выконвацца дасканала. Па-трэцяе, я не дазваляю сваім першакурснікам глядзець выступленні іншых факультэтаў і заўсёды раю ім забыцца пра журы і месцы, працаваць толькі для мяне і гледачоў. Мае шчырыя падзякі першакурснікам, усяму філфаку, а таксама В. Герасіменка, Т. Філіпенка і Н. Мартынавай.*

*Леанід Пятровіч КУЗЬМІЧ, намеснік дэкана філфака:*

*– Нашы студэнты аддана і настойліва працавалі, імі кіравалі вопытныя культоргі, у іх верыў і падтрымліваў увесь факультэт. Акрамя таго, была створана добрая праграма, асабліва па сваіх маральна-этычных якасцях. Яна дазволіла праявіць таленты выканаўцаў, падалася цікавай і пры гэтым не ўтрымлівала аніякай пошласці.*

*Святлана ЦІХАНЕНКА, культорг факультэта замежных моў:*

*– "Першакурснік" мінулага года быў больш яскравым. Тады было больш "выбухаў" у факультэтаў. Сёлетні конкурс прайшоў роўна. Магу адзначыць яшчэ, што, як заўсёды на такіх мерапрыемствах, была вельмі цёплая і ўдзячная зала.*

*Марына ЛАВЯНЕЦКАЯ, член журы:*

*– У гэтым годзе "Першакурснік" мне не вельмі спадабаўся, асабліва першы дзень. Мабыць так здарылася таму, што тэма была філасофская, складаная для раскрыцця, і студэнты не змаглі належным чынам праявіць сябе. Аднак агульнае ўражанне неблагое. Вакал выканаўцаў, які я непасрэдна ацэньвала, быў слабы. Я б выдзеліла толькі філолагаў, біёлагаў і гісторыкаў. Дарэчы, філолагі перамаглі аднагалосна, усе суддзі без сумненняў аддалі ім першае месца!*

***

Мастацтва прадэманстравана, гледачы атрымалі асалоду, пераможцы вызначаны. Чакаем новага "Першакурсніка!"

**Наталля СТАРЧАНКА, студэнтка гр. БЖ-42 філфака.**

Містэр года-2004:

# "ПЕРАМОГА ЛЁГКА НЕ ДАЕЦЦА"

**Нашаму гораду можна ганарыцца не толькі наведаннем яго зоркамі расійскай эстрады, але і сваімі талентамі. З'явілася ў нашым горадзе адна такая яркая зорачка – Максім Бажкоў, студэнт 2 курса факультэта фізічнай культуры. Ён стаў нядаўна не толькі для Гомеля, але і для ўсёй Беларусі, чалавекам №1 – Містэрам года-2004.**

Вось што стала вядома са слоў сяброў "Містэра": "Максім – звычайны хлопец, добры сябар і спагадлівы чалавек". Можна яшчэ дадаць, што гэта прыгожы, сціплы і прыемны субяседнік.

Цікава было пазнаёміцца з "Містэрам года" бліжэй, пагутарыць з ім і задаць яму тыя пытанні, якія цікавяць землякоў Максіма (асабліва слабую палову насельніцтва). Так, Максіма я знайшла ва універсітэце.

**– Чаму ты вырашыў звязаць сваё жыццё са спортам?**

– Пачынаў я са звычайных трэніровак, дзе мяне заўважылі па прычыне майго высокага росту. Потым запрасілі на веславанне, і я стаў займацца гэтым відам спорту. Затым паступіў у вучылішча алімпійскага рэзерву, правучыўся там два гады, а ўжо пасля яго заканчэння стаў студэнтам факультэта фізічнай культуры ГДУ. Удзельнічаў у розных універсітэцкіх мерапрыемствах: "Ану, першакурснік!", гала-канцэртах. Такім чынам мяне тут і заўважылі, запрасілі паспрабаваць паўдзельнічаць у конкурсе "Містэр года". Прапанавала мне гэта мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба М.Б. Шырынкіна. Я згадзіўся. Да гэтага яшчэ ўдзельнічаў у шоу прычосак, якое праводзілася мадэльным агенцтвам "Грацыя".

**– Як у цябе атрымлівалася сумяшчаць вучобу, трэніроўкі і падрыхтоўку да конкурсу?**

– Як заўжды. Так усё жыццё праходзіць. Зразумела, было цяжка, але спраўляўся.

**– Ці разлічваў на перамогу ў конкурсе "Містэр года"?**

– Так, безумоўна. Заўсёды трэба верыць у перамогу. Хаця сапернікі былі дастойныя.

**– Як рэагавалі бацькі, сябры, каханая дзяўчына на тваё рашэнне прыняць удзел у мерапрыемстве такога маштабу?**

– Усе былі вельмі задаволены. Ім мая ідэя спадабалася, мяне падтрымалі. Вельмі радаваліся і ў дэканаце: жадалі поспехаў, віншавалі. Зараз мяне пазнаюць са старонак газет, часопісаў, на тэлеэкране. Бывае так: праходзіш сярод натоўпу людзей і чуеш: "Містэр! Містэр!..." А сяброў стала значна больш. Нават з былымі сапернікамі па конкурсу здружыліся. Не так даўно былі на чарговай рэпетыцыі і арганізатар запыталася: "Ці будзем супрацоўнічаць далей?". Усе дружна згадзіліся. Пасля "Містэра" таксама былі агульныя рэпетыцыі, разам рабілі "Хлоўін" (выступалі ў ГЦК): рабілі самі касцюмы, хадзілі па подыуме. І зараз ідуць рэпетыцыі.

**– Якія эмоцыі, уражанні засталіся пасля конкурсу?**

– Усё так хутка праляцела! Пасля таго, як стала вядома, што я – пераможца, у мяне наогул ніякіх пачуццяў не было. Добра, што ў канцы да мікрафона не запрасілі. Я так разгубіўся!

**– Ці праўда, што тваёй асобай зацікавіўся Саша Варламаў?**

– Так, сапраўды. Мне пасля конкурсу далі яго візітную картку, прапанавалі бясплатнае навучанне ў Мінску. Збіраюся прыняць прапанову. Калі ёсць такі шанс, чаму ім не скарыстацца?! Зараз думаю, як сумясціць вучобу ва універсітэце з планамі ў сталіцы.

**– Як ты думаеш, якой павінна быць мэта жыцця?**



– *(Задумаўся)* Галоўнае – яе вызначыць і імкнуцца ажыццявіць. Чалавек павінен дакладна ведаць, чаго ён чакае ад жыцця, кім хоча стаць і якое месца ў ім заняць. Ёсць мэты не вельмі маштабныя, тады чалавек хутка прыходзіць да іх, а ёсць такія, якіх трэба дасягаць паступова, крок за крокам.

**– Што асабіста для цябе азначае шчасце, сяброўства і каханне?**

– Усё. Так, усё. І немагчыма вызначыць нешта адно, галоўнае. Усё гэта вельмі важна ў жыцці. Гэтыя рэчы ўзаемазвязаны. Не можа быць шчасця без сяброўства, кахання, і наадварот.

**– Што б ты хацеў пажадаць нашым чытачам і ўсім, хто табой цікавіцца?**

– Хай усе ставяць перад сабой мэты і дасягаюць іх.

**– Табе, Максім, таксама жадаем поспехаў, здзяйснення ўсіх мар і планаў.**

**Размову вяла
Кацярына КУШНЯРОВА,
студэнтка гр. БФ-22 філфака.
Фота А. БЕЛАВУСАВА.**

## ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ ЛЬГОТ И КОМПЕНСАЦИЙ

**Согласно нормативным документам ряд сотрудников университета имеют право на получение льгот и компенсаций по условиям труда.**

**Для издания приказа по университету на получение льгот в 2005 году по условиям труда руководителям всех подразделений необходимо до 20 декабря 2004 года представить в отдел охраны труда и техники безопасности списки сотрудников, имеющих право на льготы.**

**Справки по телефону: 56-41-92.**

**ОТДЕЛ ОХРАНЫ ТРУДА И ТЕХНИКИ БЕЗОПАСНОСТИ.**

## ПАДАРОЖЖА Ў ГЛЫБІНЮ СТАГОДДЗЯЎ

**Нельга не пагадзіцца з тым, што сапраўдная радасць – гэта адкрыццё раней невядомага. У тым ліку наведванне новых мясцін, якія тояць у сабе багатыя звесткі аб нашым мінулым, нашай гісторыі.**

Ідзе навучальны год. У аўдыторыях гучаць галасы студэнтаў, якія прыйшлі сюды, каб атрымаць веды, узбагаціць свой інтэлект. Лекцыі, практычныя заняткі, семінары фарміруюць з іх людзей захопленых, таленавітых, адначасова прафесійна падрыхтаваных. Аднак на філалагічным факультэце шукаюць яшчэ і самыя неардынарныя формы ўдасканалення вучэбнага працэсу: кіраўніцтва факультэта ўсяляк садзейнічае таму, каб студэнты маглі не толькі папаўняць веды ў аўдыторыях. Выкарыстоўваецца і такая форма адукацыі, як літаратурна-вучэбныя экскурсіі па памятных мясцінах роднай Беларусі і блізкага замежжа.

Дзякуючы падтрымцы дэкана Уладзіміра Андрэевіча Бобрыка, яго намесніка Леаніда Пятровіча Кузьміча і старшага выкладчыка кафедры беларускай літаратуры Веры Савельеўны Генаш у мінулым навучальным годзе былі арганізаваны экскурсіі ў Тураў, Полацк, Кіеў, Нясвіж.

А нядаўна група студэнтаў-філолагаў наведала Полацк – адзін са старажытнейшых гарадоў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Упершыню ён узгадваецца ў летапісах у 862 годзе. Найвялікшага палітычнага росквіту і самастойнасці горад дасягнуў пры Усяславе Чарадзеі. Пасля яго смерці Полацкая зямля была падзелена паміж яго сынамі і складалася з некалькіх княстваў. Праз вякі прайшла зямля полацкая, пакуль не стала невялічкім раённым горадам Віцебскай вобласці на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Тут экскурсанты сустрэліся са шматлікімі скарбамі мінулых гадоў: убачылі старажытныя плошчы, помнікі Ефрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага – нашых славутых землякоў, вучоных, асветнікаў.

Вельмі ўразіў архітэктурны помнік сівой мінуўшчыны, выдатны ўзор беларускага дойлідства – Полацкі Сафійскі сабор. А побач з ім – Барысаўскі камень як помнік язычніцкай веры. Існуе паданне: калі абысці гэты камень тры разы, дакрануцца да яго і загадаць жаданне, то яно абавязкова збудзецца.

У Полацку дзейнічае шмат музеяў, якія раскрываюць перад турыстамі старонкі гісторыі Беларусі. Студэнты наведалі музей друку, дзе сабраны звесткі аб тым, як ствараліся кнігі ў розныя часы беларускай гісторыі. У яго шматлікіх залах яны ўбачылі копіі і арыгіналы кніг Скарыны, Цяпінскага, Сымона Буднага, даведаліся, як выраблялі папірус, упрыгожвалі гатовыя кнігі, і нават колькі яны каштавалі.

Потым была сустрэча са Спаса-Ефрасіньеўскай царквой, на тэрыторыі якой зараз дзейнічае жаночы манастыр. Царкву заснавала Ефрасіння Полацкая, там захоўваюцца яе цудадзейныя мошчы, а таксама знакаміты крыж, зроблены ў 1161 годзе выдатным майстрам старажытнасці Лазарам Богшам. Крыж бясследна знік у гады Вялікай Айчыннай вайны, але зараз узноўлены сучасным майстрам.

Магчымасць убачыць усе тыя святыні, пра якія нам расказваюць на лекцыях, дакрануцца да ўспамінаў аб жыцці продкаў, каб зразумець іх душу – вось вынік экскурсіі. Праўду кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць.

Доўгая дарога ад Гомеля да Полацка нікому не надакучыла, таму што арганізатары экскурсіі паставіліся да сваёй працы вельмі сумленна і зрабілі ўсё найлепшым чынам. З гэтай нагоды ад імя ўсіх удзельнікаў экскурсіі і кіраўніцтва філалагічнага факультэта выказваем падзяку Гомельскаму бюро падарожжаў і экскурсій і асабіста Людміле Паляvой, Віктару Блізняцу, вадзіцелям Ігару і Мікалаю.

**Кацярына БАЙДАКОВА,
студэнтка гр. БЖ-52
філалагічнага факультэта.**

СПОРТ

## ЮРИЙ КОЛЕСНЕВ – ПОБЕДИТЕЛЬ КУБКА МИРА!



Под занавес спортивного сезона приятная новость пришла из столицы Грузии – Тбилиси. Здесь состоялись соревнования по греко-римской борьбе за командный Кубок мира, а спор за престижный трофей вели команды Ирана, США, Франции, Грузии и Беларуси.



Почетный трофей завоевали хозяева ковра, на последующих местах дружины из Ирана, США и Беларуси.

В весовой категории до 66 кг победителем Кубка мира стал пятикурсник факультета физической культуры Юрий Колеснев, который оказался сильнее борцов из Ирана – 8:4, США – 9:1, Франции – 4:0 и Грузии – 3:1. Юрию вручили диплом победителя Кубка мира 2004 года.

В настоящее время Ю. Колеснев тренируется в Гомельской областной школе высшего спортивного мастерства под руководством тренера Александра Фурсеева. К этому следует добавить, что наш спортсмен принимал участие в квалификационном турнире за право участвовать в Олимпийских играх в Афинах, где занял 5-е место (занявшие первые 4 места получили путевки на игры).

А в августе текущего года в Германии, в городе Дортмунде, проходил крупный международный турнир по греко-римской борьбе из серии Гран-при, и наш студент стал его серебряным призером. Так что победа Юрия Колеснева на Кубке мира не относится к числу случайных.

**Фото В. ЧИСТИКА.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады па кафедры:**

– фізвыхавання і спорту – старшага выкладчыка.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

## НА ПОМОСТЕ – БОГАТЫРИ

В спортивном комплексе "Гомсельмаш" прошло первенство области по пауэрлифтингу (силовое трохборье).

Выше всяких похвал выступили студенты нашего университета, которых тренирует старший преподаватель кафедры физического воспитания и спорта, чемпион Европы среди ветеранов по пауэрлифтингу, мастер спорта Владимир Головач.

На высшую ступеньку пьедестала почета поднялись студенты факультета физической культуры мастер спорта Алексей Николаенко (2 курс, весовая категория до 75 кг), мастер спорта Сергей Новик (5 курс, 90 кг) и Александр Побегаев (100 кг), а также третьекурсник геолого-географического факультета Алексей Аксененко (110 кг).

Серебряных наград удостоены второкурсники экономического факультета – Алексей Голубев (56 кг), факультета физической культуры – Артем Сергеенко (75 кг) и физического факультета – Александр Толкачев (82,5 кг), который, кстати, впервые выполнил норматив кандидата в мастера спорта Республики Беларусь.

Теперь наши богатыри готовятся к республиканским соревнованиям.

**В. МАРЧЕНКО,
наш спортивный обозреватель.**

## ДАЛЁКІ І БЛІЗКІ ВОРАГ

### 1 снежня – сусветны дзень прафілактыкі СНІДу

**Зараз, калі страшная хвароба, быццам моцны і ўпэўнены вораг, заваёўвае ўсё большыя тэрыторыі, абыякава ставіцца да яе – вялікае злачынства.**

**За здароўе нацыі трэба змагацца шляхам захавання свайго ўласнага. А як лічыце вы?**

**АЛЕНА, юрыдычны факультэт:**

– Ад СНІДу ніхто не застрахаваны. Я імкнуся не ўступаць ні ў якія адносіны з людзьмі групы рызыкі. І не толькі з імі – неахайныя, брудныя з выгляду людзі таксама мяне насцярожваюць.

Можа я б так востра не адчувала праблему, калі б не шматлікія плакаты і памяткі ў гарадскім транспарце, аптэках, паліклініках.

Думаю, што той, хто не жадае захварэць, адносіцца да свайго жыцця і здароўя сур'ёзна, мае вялікі шанс засцерагчы сябе ад такой праблемы.

**ТАНЯ, філалагічны факультэт:**

– Мне здаецца, што ў нашым горадзе пытанне прафілактыкі СНІДу закранаецца недастаткова. Трэба больш праводзіць рэкламных акцый або, як у нашым універсітэце, выстаў плакатаў "АнтыСНІД".

Гэта неабходна для таго, каб усё большая колькасць людзей змагла ўсвядоміць сур'ёзнасць пагрозы СНІДу.

**Святлана Міхайлаўна АНІСЬКОВА, выкладчык кафедры беларускай мовы:**

– Трэба быць вельмі ўважлівымі ў медыцынскіх установах, сачыць, каб з вамі працавалі толькі стэрыльнымі інструментамі. Неабходна заўсёды памятаць аб пагрозе СНІДу. Яна да нас усё бліжэй і бліжэй. Калі раней СНІДам, як лічылася, хварэлі толькі людзі групы рызыкі (наркаманы, гомасексуалісты і інш.), то зараз значна пашырыліся шляхі перадачы хваробы.

І хаця мы ведаем, што з такімі людзьмі можна мець розныя сацыяльныя ўзаемаадносіны, пры якіх СНІД не перадаецца, але падсвядома ўзнікае страх захварэць.

Канешне, трэба весці здаровы лад жыцця, мець высокую сексуальную культуру і вельмі ўважліва адносіцца да свайго здароўя.

Дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку трагічнай гібелі студэнткі 2 курса **САКАЛОВАЙ Юліі** і выказваюць спачуванне яе родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны».

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г.

Рэгістрацыйны № 263.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР
Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4488.
Падпісана да друку 23 лістапада ў 11.30.